# СТАТКЕВІЧ Мікалай Віктаравіч



Нарадзіўся 12 жніўня 1956 г. у Слуцкім раёне ў сям'і настаўнікаў.

Закончыў Мінскае вышэйшае інжынернае зенітнае ракетнае вучылішча. Служыў у Запаляр'і. Абараніў кандыдацкую дысертацыю і выкладаў у МВІЗРВ. Кандыдат тэхнічных навук, спецыяліст у галіне кіравання. Падпалкоўнік запаса.

У цяперашні час з'яўляецца кіраўніком прадстаўніцтва Беларускага Незалежнага прафсаюза гарнякоў, хімікаў, нафтаперапрацоўшчыкаў, энергетыкаў, транспартнікаў, будаўнікоў і іншых работнікаў г. Мінска.

У 1993 г. выступіў супраць Дамовы аб калектыўнай бяспецы з ваюючымі краінамі (Арменія, Таджыкістан і інш.), па ўмовах якой Беларусь павінна была адпраўляць сваіх салдат на чужыя войны.

У 1996 г. быў абраны старшынёй Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада).

З 2003 г. узначальвае Еўрапейскую кааліцыю, у якую ўваходзіць шэраг партый, прафсаюзных, жаночых і маладзёжных арганізацый. Аўтар многіх работ у галіне паліталогіі, міжнародных адносін. Вылучаны кандыдатам у Прэзідэнты Кангрэсам «Еўрапейскай кааліцыі», у якім бралі ўдзел больш за 700 дэлегатаў.

Выгадаваў дзвюх дачок.